# Водзыў
## на аўтарэферат кандыдатскай дысертацыі Рамана Дзмітрыевіча Галынскага "Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст."

Кандыдацкая дысертацыя Рамана Дзмітрыевіча Галынскага прысвечана актуальнай тэме беларускай урбаністыкі, а менавіта – Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва, што шчыльна звязана з гісторыіяй штодзённага побыту гарадскога насельніцтва Беларусі ў сярэдневяковы перыяд і Новы час.

Трэба адзначыць, што гэтая тэма станавілася аб'ектам ўвагі яшчэ на пачатку 1980-х і ў 1990-я гады мінулага стагоддзя. Прыкладам таму публікацыі беларускіх этнолагаў Лідзіі Малчанавай і Ігара Чаквіна [Молчанова Л. И. Очерки материальной культуры белоруссов XVI–XVIII вв. – Минск: Наука и техника, 1981; Чаквін І. У. Грамадзкі побыт і духоўная культура гарадзкога насельніцтва Беларусі. – Мн., 1990]. Але ў гэтых работах па-за ўвагаю даследчыкаў апынуліся напрацоўкі беларускіх археолагаў М. Ткачова, В. Ляўко і Л. Калядзінскага, якія вывучалі матэрыяльную культуру гарадоў Беларусі перыяду позняга сярэдневякоўя і Новага часу. Адзначаныя вышэй работы этнолагаў грунтаваліся выключна на дадзеных пісьмовых крыніц. І першай работай, дзе удала спалучаліся дадзеныя пісьмовых крыніц і дадзеныя археалогіі для асвятленя гісторыі штодзённасці гарадскога насельніцтва была работа Ігара Аляксандраіча Марзалюка [Марзалюк І.А. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы. Магілёў–Мінск, 1998]. У далейшым работу ў такім рэчышчы працягваў Валерый Пазднякоў [Пазднякоў В.С. Клецк X–XVIII стст.: матэрыяль. і духоўн. культура беларуск. феадальнага горада. – Мн., 2008]. У абагульняючым выглядзе такую работу зрабіў Ігар Вуглік [Вуглік І.Р. Матэрыяльная культура і быт беларусаў XVII–XVIII стст.: вучэбны дапаможнік. – Мн.: БДПУ, 2005]. Але яго даследаванне закранула археалагічны матэрыял толькі ў самай малой ступені і ўвасобіліся адно ў вучэбны дапаможнік. Пэўныя напрацоўкі па дадзенай праблеме рабіліся таксама намі [Колединский, Л. В. / Л. В. Колединский. Виталитивная культура Витебска в конце XIII – середине XIV в. (по материалам раскопок Верхнего замка Витебска) // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Полацк, 22–23 мая 2012 г.) / Нац. акад. навук Беларусі, Ін - т гісторыі, Полацкі дзярж. ун - т; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – С. 437–455; Колединский Л.В. Мировосприятие и мироощущение жителей Витебска в XII–XVII вв. (по материалам раскопок Верхнего замка) // Романовские чтения – 3. Могилёв: МГУ им. А.М. Кулешова, 2019. С. 4–11].

У рабоце Рамана Дзмітрыевіча Галынскага ўдала спалучаюцца дадзеныя археалогіі і наратыўных крыніц. І хаця яго работа прадстаўлена на суіскальніцтва вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, тым не менш яна магла б

праходзіць і па дзвюх спецыяльнасцях – па айчыннай гісторыі і археалогіі. Аўтар дысертацыі не толькі выкарыстоўваў археалагічныя дадзеныя сваіх папярэднікаў, але і сам праводзіў археалагічныя даследванні. Археалагічны матэрыял, які ўключаны ў работу падаецца грунтоўна і кваліфікавана. Можна адзначыць лагічную структуру работы. Аўтарэферат дысертацыі дае поўнае ўяўленне аб зробленай аўтарам рабоце. Прыводзяцца звесткі аб крыніцах даследвання, раскрыта гісторыя, апісана тапаграфія замка і гарадскога паселішча для розных часоў іх існавання, даследавана матэрыяльная культура замка і горада.

Несумненную цікавасць маюць і звесткі пра тагачасныя гарадскія могільнікі, якія захаваліся да нашага часу. Тэма гарадскіх пахаванняў у параўнанні з пахаваннямі сельскага насельніцтва распрацавана ў беларускай археалогіі значна меней. Паколькі гэты від археалагічных помнікаў у выніку ўрбанізацыйных працэсаў інтэнсіўна разбураўся пачынаючы з XVIII ст., таму ў якасці парады аўтару дысертацыі мы прапануем пры дапрацоўцы яго тэксту ў манаграфію, археалагічна даследаваць гарадскі могільнік Быхава. Атрыманыя дадзеныя змогуць даць інфармацыю не толькі пра ўзрост і пол пахаваных, але, што самае важнае, і пра стан здароўя насельніцтва, пра хваробы, на якія пакутлівалі тагачасныя жыхары Быхава.

Дысертацыйная работа Рамана Дзмітрыевіча Галынскага будзе важкім ўнёскам у гісторыю беларускай урбаністыкі. Аўтар дысертацыі несумненна заслугоўвае прысуджэння яму навуковай ступені кандыдата гістарычных навук.

Ст. навуковы супрацоўнік Цэнтра даследванняўБеларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Л.У. Калядзінскі

Л. Калядзінскі

12.03.2023